Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

15 студзеня 2014 г. СЕРАДА № 6 (27616) Кошт 1800 рублёў

Б Е Л А Р У С К А Я Г А З Е Т А

Чым зацікавіць маладога спецыяліста

СТАР.4

Як бавяць час пенсіянеры

СТАР.5

Высокае мастацтва — у армейскім страі

СТАР.6

НЕАДНАБАКОВАЯ ВЫГАДА

Рэалізацыя інвестпраекта па вытворчасці ў Барысаўскім раёне легкавых аўтамабіляў абмяркоўвалася 14 студзеня на рабочай сустрэчы Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі з прэм'ер-міністрам Міхаілам Мясніковічам і старшынёй Мінаблвыканкама Сямёнам Шапірам. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.

«У пачатку нашай размовы можна сказаць: тое, аб чым марылі многія беларусы і, перш за ўсё, я, здзейснілася, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Беларускі аўтамабіль мы вырабілі разам з нашымі кітайскімі сябрамі і, паводле маіх даных, прыкладна 2,5 тыс. прадалі ў мінулым годзе. І попыт на такі тып аўтамабіляў ёсць не толькі ў Беларусі, але і за межамі нашай краіны».

Прэзідэнт пацікавіўся наяўнасцю магчымых праблем у працэсе вытворчасці і рэалізацыі аўтамабіляў. «Вы цудоўна разумееце, што мы, вырабляючы ў Беларусі з кітайскімі сябрамі гэты аўтамабіль, умешваемся ў святая святых перш за ўсё Расіі. Мы будзем яго прадаваць па ўсім свеце, у тым ліку ў Расіі і Казахстане, — адзначыў беларускі лідар. — Мяне цікавіць сённяшняя рэакцыя расійскага аўтапрамаўскага лобі. Але, я так разумею, у Расіі гэты аўтамабіль атрымаў усе дазволы і сертыфікаваны. Мы маем магчымасць яго там прадаваць. У сувязі з гэтым — пытанне ўтылізацыйнага збору. Як яно вырашаецца? Лічу, што трэба і кітайскіх таварышаў да гэтага падключаць і вырашаць гэту праблему, калі яна існуе».

«Справа нашага гонару гэты аўтамабіль вырабіць менавіта ў такіх аб'ёмах і ў тыя тэрміны, якія мы плануем», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

«Аўтамабіль добры, ён карыстаецца попытам. Значыць, трэба яго вырабляць. Больш таго, нямала нашых буйных прадпрыемстваў атрымліваюць заказы на вытворчасць камплектуючых. Таму гэта вельмі важны навукаёмісты інавацыйны праект, і мы яго абавязкова павінны рэалізаваць», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Пры гэтым вытворчасць у Беларусі айчыннага легкавога аўтамабіля на ўзроўні сусветных стандартаў Прэзідэнт паставіў у адзін рад з рэалізацыяй праектаў у сферы космасу і будаўніцтвам АЭС.

Паводле слоў Міхаіла Мясніковіча, у Барысаве ўжо рэалізаваны першы этап па стварэнні зборачнай вытворчасці магутнасцю 10 тыс. аўтамабіляў у год. У далейшым прадугледжваецца стварэнне экспартаарыентаванай вытворчасці магутнасцю 120 тыс. аўтамабіляў у год. Праект плануецца рэалізаваць сумесна з кітайскай кампаніяй «Джылі». «Мы выкарыстоўваем іх вопыт. Гэта вялікая, адна з вядучых кампаній, якая вырабляе некалькі соцень тысяч аўтамабіляў у год і мае даволі добрую рэпутацыю на рынках. У цэлым праект ацэньваецца прыкладна ў $650 млн, у тым ліку інвестыцыі ў асноўны капітал — амаль $450 млн», — расказаў ён.

Урадам распрацаваны праект указа Прэзідэнта «Аб некаторых пытаннях арганізацыі вытворчасці легкавых аўтамабіляў». «Мы не спяшаліся з гэтым указам, таму што трэба было стварыць магутнасці па буйнавузлавой зборцы і паглядзець, як рэагуе рынак на яшчэ аднаго вытворцу легкавых аўтамабіляў», — сказаў прэм'ер-міністр.

Міхаіл Мясніковіч прызнаў, што ўмовы рэалізацыі няпростыя, паколькі толькі ў Расіі цяпер працуюць каля трох дзясяткаў прадпрыемстваў па зборцы легкавых аўтамабіляў. І ў гэтым плане неабходна працаваць як над скарачэннем выдаткаў, так і імкнуцца да таго, каб у Беларусі фарміравалася максімальная дабаўленая вартасць, а адпаведна зарплата рабочых, падатковыя паступленні. Адначасова і ў кітайскага боку павінна быць зацікаўленасць працаваць у Беларусі і сумесна вырабляць аўтамабілі. «Тут не можа быць аднабаковай выгады. Праект павінен быць узаемавыгадным, і да гэтага мы імкнёмся. Гэта закладзена ў аснове праекта ўказа», — падкрэсліў прэм'ер-міністр.

ЦАРскія каляды

Уноч з 13 на 14 студзеня ў вёсцы Семежава Капыльскага раёна чарговы раз з'явіліся «цары» — захавальнікі старажытнага беларускага каляднага абраду.

Сваім узнікненнем унікальны абрад абавязаны салдатам і афіцэрам царскай арміі, якія ў XVIII стагоддзі, знаходзячыся на Капыльшчыне, падчас калядных свят хадзілі па хатах мясцовых жыхароў і паказвалі вясёлыя сцэнкі. За ўсмешкі і добры настрой сяляне дзякавалі «акцёрам» прысмакамі. Салдаты пайшлі з вёскі, а яе жыхары захавалі традыцыю, узбагацілі святочнае дзеянне ўнікальнымі асаблівасцямі.

«Царская» дэлегацыя, што складаецца з «салдат» (маладых мужчын, апранутых па-святочнаму, у белае, падперазаныя крыж-накрыж саматканымі семежаўскімі паясамі), двух цароў, лекара, бабы і кульгавага дзеда, наведала двары семежаўцаў. Лічыцца, што калі «цары» завіталі ў хату, то наступны год будзе шчаслівы і багаты. У хаце хлопцы паказвалі эпізод гістарычнай драмы «Цар Максіміліян», спявалі і жартавалі.

Калі на вуліцы стала цёмна, дарогу «царам» асвяцілі паходні.

На 17-ы год пасля адраджэння абраду частка «вопытных цароў» пакінула «прастол», саступіўшы месца маладым:

— Гэта першы год, калі я ўдзельнічаю ў «царах» як звычайны селянін, — расказвае «цар Мамай» са стажам Георгій Ціманаў. — Няхай маладыя цяпер пераймаюць і захоўваюць традыцыю. Я ім дапамагаю, падказваю, што і як трэба рабіць. Нават два семежаўскія паясы, якія мне падаравалі бабулі 17 гадоў таму, падчас першых «цароў», я прэзэнтаваў клубу.

У 2009-м народны семежаўскі абрад «Калядныя цары» быў уключаны ў спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны ЮНЕСКА.

Любоў БЯЛЯЕВА. Фота аўтара.

ЛІЧБА ДНЯ

На 20%

прыраслі рублёвыя дэпазіты ў краіне за 2013, валютныя — на 9,8%, гаворыцца ў статыстычнай справаздачы Нацыянальнага банка Беларусі. Пры гэтым за апошні месяц мінулага года рублёвыя дэпазіты юрыдычных і фізічных асоб выраслі на 3,6%, склаўшы на 1 студзеня Br65,18 трлн. Валютныя ўклады юрыдычных і фізічных асоб у снежні павялічыліся на 3,5% і склалі $11,3 млрд на пачатак 2014 года.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 15.01.2014 г.

Долар ЗША	9550,00	▲
Еўра	13040,00	■
Рас. руб.	287,50	▼
Укр. грыўня	1148,88	▼

КОРАТКА

Аб'ём шырокай грашовай масы (ШГМ) у Беларусі за 2013 год павялічыўся на 19,8 працэнта і на 1 студзеня дасягнуў Br193 трлн 306,8 млрд. Пры гэтым у снежні ШГМ прырасла на 4 працэнты.

Цэны на гасцінічныя нумары ў Мінску да чэмпіянату свету па хакеі могуць вырасці на 10 працэнтаў.

Вікторыя Азаранка выйшла ў другі раўнд Australian Open. У стартавым паядынку не без намаганняў абыграла шведку Іахану Ларсан — 7:6 (7:2), 6:2.

Да 70% парушэнняў хуткасных рэжымаў, зарэгістраваных супрацоўнікамі ДАІ Брэсцкай вобласці падчас спецмерапрыемства «Транзіт», здзейснілі расіяне. Своеасаблівы антырэкорд быў зафіксаваны ў Баранавіцкім раёне. Жыхар аднаго з расійскіх рэгіёнаў на «Аўдзі А8» рухаўся па трасе з хуткасцю 200 км/г пры дазволеных 120.

Партугалец Крышціяну Раналду прызнаны лепшым футбалістам планеты 2013 года. 28-гадовы форвард мадрыдскага «Рэала» атрымаў «Залаты мяч ФІФА» 13 студзеня на ўрачыстай цырымоніі ў Цюрыху.

■ Пакланіцца святыні

«ЗАМЕСТ ЗОЛАТА — ЗЗЯННЕ ЧЫСТЫХ СЛОЎ І СПРАЎ, ЗАМЕСТ ЛАДАНУ — МАЛІТВА»

Прыкласціся да Дароў валхвоў у Мінску вернікі змогуць ужо ў пятніцу ўвечары

Сёння каўчэг з вялікай хрысціянскай святыняй знаходзіцца ў Санкт-Пецярбургу, а ўвечары 17 студзеня яго спецсамалётам даставяць у Мінск. З 18.30 гэтага ж дня ў храме праведнага Іова шматпакутнага пры Доме міласэрнасці (прыход храма-помніка ў гонар Усіх Святых) святыня будзе даступная для пакланення.

Як расказаў клірык Усіхсвяцкага прыходу протаіерэй Мікалай Суханові, пакуль плануецца, што доступ да Дароў будзе адкрыты па 23 студзеня ўключна з 8.00 да 22.00, але ў выпадку неабходнасці (калі нават уначы будзе шмат ахвотных дакрануцца да святыні) каўчэг з Дарамі будзе даступны для пакланення круглыя суткі.

СТАР.2

АДОРАНЫЯ ТАЛЕНТАМ

Мінскі абласны Савет дэпутатаў зацвердзіў прэміі 45 навучэнцам цэнтральнага рэгіёна. Гэта пераможцы заключных этапаў рэспубліканскіх алімпіяд па вучэбных прадметах, што занялі 1, 2 і 3 месцы, і конкурсаў прафесійнага майстэрства 2013 года. Рашэнне накіравана перш за ўсё на сацыяльную падтрымку і стымуляванне інтэлектуальнай і творчай ініцыятывы дзяцей і падлеткаў.

Прэміяй у памеры 10 базавых велічынь (1 базавая велічыня — 130 тыс. рублёў) узнагароджаны Мікіта Бокшыц з сярэдняй школы № 3 г. Любані, Цімур Брытвіч з гімназіі № 3 г. Салігорска, Мікіта Сазановіч з сярэдняй школы № 3 г. Стоўбцы, а таксама навучэнка Мінскага дзяржаўнага абласнога ліцэя Юлія Васілевіч. За другое месца належыць прэмія ў 8 базавых велічынь, за трэцяе — 6.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.

■ Жыллё

СЕЗОН ГЛАБАЛЬНАГА «ПАХУДЗЕННЯ»?

Паводле прагнозаў спецыялістаў, да лета сталічная жыллёвая нерухомасць патаннее да 1300 долараў за «квадрат»

Устойлівы рост сярэдніх цэннікаў на сталічныя кватэры, які назіраўся на працягу 8 месяцаў летась, у верасні спыніўся. А вось пачынаючы з кастрычніка, мінскі другасны рынак жылля пачаў паціху здаваць свае пазіцыі. Чаго нам чакаць на мінскім рынку жылля сёлета? Зрабіць аналіз сітуацыі ў жыллёвай сферы сталіцы карэспандэнту «Звязды» дапамагае наш пастаянны эксперт — кіраўнік агенцтва «БепЦТН», старшыня рады Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць» Мікалай ПРАСТАЛУПАЎ.

Актыўнасць пакупнікоў імкнецца да нуля

Летась у першым паўгоддзі кватэры Мінска ўпэўнена даражэлі ажно да верасня, пасля чаго стабілізаваліся і адзначылася тэндэнцыя на патанненне. Сапраўдная рэальная карэкціроўка цэн пачалася менавіта ў кастрычніку. Потым кожны месяц цэны падалі прыкладна на 2-2,5%. За гэты час колькасць здзелак скарацілася прыкладна ўдвая, расказвае наш эксперт. Ужо ў сярэдзіне снежня на рынку засталіся пераважна кватэры з завышанымі цэнамі. Таму тыя прадаўцы, якія хацелі прадаць свае кватэры, згаджаліся на зніжэнне цэннікаў. У выніку за мінулы год, з улікам падзення ў апошнія 4 месяцы, цэны на мінскія другасныя кватэры выраслі прыкладна на 15%.

Павялічэнне кошту кватэр у 2013 годзе Мікалай Прасталупаў тлумачыць ростам сярэдняй заработнай платы, якая ў параўнанні з 2012 годам павялічылася практычна ў паўтара раза. Аднак такая сітуацыя не магла працягвацца бясконца, бо адначасова назіралася павялічэнне цэннікаў на энерганосьбіты, тавары і паслугі. Стала зразумела, што немаленькая інфляцыя ў краіне захаваецца і ў 2014 годзе. Рэальнае зніжэнне даходаў сярэднята класа жыхароў сталіцы стала адбівацца і на цэнніках жыллёвай нерухомасці. Аднак і цяпер яшчэ асноўная маса прадаўцоў усё яшчэ жыве чаканнямі лета мінулага года, калі рэальная цана здзелкі складала прыкладна 1700 долараў за квадратны метр. Праўда, у апошнія дні года ў дагаворах куплі-продажу кватэр фігураваў кошт квадратнага метра прыкладна ў межах каля 1600 долараў за жыллёвы «квадрат». Але зараз і такі ўзровень цэннікаў не з'яўляецца для пакупнікоў прывабным. Некаторыя кватэры нават па такім кошце немагчыма прадаць.

СТАР.4

КУЛЬТУРА ЗДАРОЎЯ: фізічная актыўнасць



ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

БРЫТАНСКАЯ ПАЛІЦЫЯ РАЗАГНАЛА АКЦЫЮ ПРАТЭСТУ ЭКОЛАГАЎ

У Вялікабрытаніі прайшла паліцэйская аперацыя па задушэнні так званых акцый прамога дзеяння з удзелам дзясяткаў радыкальных эколагаў, якія выступаюць супраць здабычы сланцавых нафты і газу. Пад вартай апынуліся шэсць актывістаў. Затрыманні праходзілі ў горадзе Солфард на паўночным захадзе Англіі, дзе кампанія IGas Energy пачала працэс разведвальнага свідравання. Для здабычы сланцавых газу і нафты выкарыстоўваецца метад фрэкінгу, або гідраўлічнага разрыву пласта. На думку спецыялістаў, ён стварае пагрозу забруджвання крыніц пітной вады хімікатамі, а таксама можа правакаваць землятрусы. У сувязі з гэтым у большасці краін Еўропы на распрацоўку сланцавых радовішчаў накладзены мараторый.

У ТАДЖЫКІСТАНЕ АНАНСАВАЛІ ПЕРАХОД ШКОЛ НА 100-БАЛЬНУЮ СІСТЭМУ

У Таджыкістане плануюць увесці новую сістэму ацэнкі ведаў вучняў. Пра гэта паведамляе «Азія-Плюс» са спасылкай на намесніцу міністра адукацыі і навукі Тачыніса Махмадаву. Гаворка ідзе пра пераход ад пяцібальнай да стабальнай сістэмы ацэнак. Паводле інфармацыі міністэрства, ініцыятыва, звязаная з укараненнем у Таджыкістане міжнародных стандартаў адукацыі. «100-бальная сістэма ацэнкі дасць магчымасць абітурыентам паступіць у ВНУ замежных краін, дзе практыкуецца такая сістэма», — адзначылі ў прэс-службе ведамства адукацыі.

У НАРВЕГІІ ЗАМЕРЗЛА РЫБА

Нарвежскае нацыянальнае радыё паведаміла пра імгненную гібель тысяч рыбін у заліве на востраве Ловунд. Тэмпература паветра там на той момант дасягала мінус 78 °С. Асноўнай прычынай трагедыі стаў кашмарны холад у спалучэнні з моцным усходнім ветрам, які цягам некалькіх гадзін ператварыў мора ў лёд. Мноства рыбы трапіла ў лядовую пастку і было замарожана імгненна. Гэтая анамальная тэмпература з'яўляецца незвычайнай не толькі для Нарвегіі, але і нават для Паўночнага полюса.



ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

КАРЫСЦЬ СОКАЎ — МІФ?

Брытанскія эксперты заклікаюць выкрасліць пладовы сок са спіса рэкамендаваных прадуктаў, якія павінны перакрываць патрэбу чалавека ў пяці порцыях агародніны і садавіны на дзень, перадае The Hindu. Сутнасць у тым, што ў соку столькі ж цукру, колькі і ў газіроўцы. У прыватнасці, шкодным фруктовы сок лічыць Сьюзан Джэб, кіраўнік даследаванняў атлусцення і харчавання ў Кембрыджы. Цукар з соку ўсмоктваецца практычна імгненна. Таму да таго моманту, калі сок трапляе ў страўнік, цела ўжо не можа адрозніць, напрыклад, апельсінавы сок ад колы.

Лепш з'есці цэлы плод, а сок, калі вельмі хочацца піць, варта разводзіць вадой. Трэба сказаць, аналагічныя асцярогі выказваліся яшчэ ў 2004 годзе іншымі даследчыкамі. Яны тады прыйшлі да высновы, што сокі і смузі (кактэйль з садавіны) з'яўляюцца новай пагрозай для рацыёну сучасных людзей.

Напрыклад, можна з'есці 1-2 апельсіны і насыціцца або выпіць смузі з 6 апельсінаў, а праз шэсць гадзін пад'есці так, быццам да смузі і не елі зусім. Больш за тое, падобны напой можна па канцэнтрацыі цукру параўнаць з вялікай порцыяй колы.